■ Будзем у курсе

ХЛОПЦЫ З БІТАМІ,

або Як бейсбол у нашай краіне ператварыўся з экзотыкі ў спорт

Гэтая гульня малюе ва ўяўленні яркія карцінкі: бездакорнае поле, спартсмены ў ідэальнай форме, запоўненыя балельшчыкамі трыбуны. Падобна на кадры з амерыканскіх фільмаў, але, аказваецца, іх можна ўбачыць і ў Беларусі. Ужо больш за 20 гадоў бейсбол развіваецца ў нашай краіне.

Бейсбольны клуб «Мінск».

ЯК УСЁ ПАЧЫНАЛАСЯ

У розных частках свету людзі гулялі ў падобную на сённяшні бейсбол гульню, аднак правілы і назвы яе часта былі рознымі: у нас — лапта, у Англіі — роўндэрс, у Германіі — шлагбол, у ЗША — «база» або «базавы мяч». Менавіта таму назваць дакладную яго радзіму і месца ўзнікнення даволі цяжка, зразумела адно — такі від баўлення вольнага часу, а менавіта забавай бейсбол быў першапачаткова, існуе ўжо не адно стагоддзе.

Першая прафесійная ліга была створана ў ЗША ў 1871 годзе, у гэты ж час бейсбол там здабыў вялікую папулярнасць, і сёння гульня з'яўляецца адной з самых запатрабаваных за акіянам. Першы ж афіцыйны чэмпіянат свету прайшоў пазней — у 1938-м, у ім сустрэліся амерыканцы і англічане, апошнія атрымалі безумоўную перамогу. Колькасць каманд-удзельніц узрастала: спачатку гэта былі ў асноўным зборныя лацінаамерыканскіх краін, і толькі ў 1970-м да іх далучыліся каманды Галандыі і Італіі, а праз два гады прадстаўнікі Азіі.

Практычна паўстагоддзя прайшло пасля пачатку правядзення чэмпіянатаў свету, як гульню ўключылі ў алімпійскую праграму, але ў 2005-м Міжнародны алімпійскі камітэт прыняў рашэнне выключыць бейсбол. У ліку прычын: недастатковая папулярнасць у большасці краін — членаў алімпійскага руху і рознагалоссі паміж МАК і Лігай бейсбола ў ЗША. Спецыялісты з розных краін адзначаюць, што сапраўднай прычынай выключэння гульні сталі зусім не спартыўныя нюансы.

Сёння ў бейсбол гуляюць больш чым у 120 краінах свету, найбольш папулярным ён лічыцца на Кубе, у ЗША, Венесуэле, Японіі і Паўднёвай Карэі. Адна гульня Сусветнай лігі ў Злучаных Штатах збірае каля 45 тысяч гледачоў, у Еўропе цікавасць да бейсбола значна меншая, напрыклад, на матч чэмпіянату Германіі прыходзіць каля дзвюх з паловай тысяч, аднак ужо і еўрапейцы лічаць гэтую гульню сваёй. Дарэчы, сёння бейсбол мае вялікую магчымасць зноў вярнуцца ў алімпійскую праграму.

А ШТО Ў НАС?

Імя чалавека, які пачаў развіваць бейсбол у Беларусі, у адрозненне ад сусветнай гісторыі, вядомае — гэта Дзмітрый Сагальчык. У войску салдату трапіўся часопісны артыкул, які расказваў пра ўключэнне гульні ў склад алімпійскіх відаў спорту. Праз нейкі час Дзмітрый ужо ствараў сваю каманду, якая ўпершыню выйшла на поле восенню 1988 года. Спачатку хлопцы назвалі сябе «Няміга», потым «Матэна» і, нарэшце, «Белавежскія зубры». Як адзначаюць гульцы, першыя гады пайшлі на вывучэнне правілаў і разуменне сутнасці самой гульні, а пасля беларускія бейсбалісты пачалі прымаць удзел і ў спаборніцтвах. Першыя гульні мінскай каманды праходзілі ў парку імя Горкага (дзе зараз гуляюць у хакей на траве), спарынг-партнёрамі для нашых бейсбалістаў сталі кубінскія студэнты, якія вучыліся ў Мінску.

Былі часы, калі ўнутраны чэмпіянат краіны налічваў 12 каманд, 8 з іх гулялі ў найвышэйшай лізе. Зараз у нас досыць аматарскіх калектываў, але ў сёлетнім першынстве краіны выступалі ўсяго 3 клубы. Віной таму матэрыяльныя цяжкасці, праблемы з наяўнасцю палёў і, галоўнае, рознагалоссі клубаў з асацыяцыяй.

Акрамя ўнутранага чэмпіянату, беларускія клубы прымаюць удзел і ў міжнародных турнірах. У гэтым годзе «Мінск» стаў пераможцам Інтэрлігі, нашы спартсмены рэгулярна выступаюць у Еўракубках і ў Кубку канфедэрацый.

Каб апрануць бейсбаліста

На ногі гулец адзявае спайкі (спецыяльны абутак), гетры і брыджы. Брыджы абавязкова павінны быць з рэменем. Патрэбны таксама гульнявая майка, куртка і бейсболка.

Бейсбол больш танны від спорту, чым, скажам, тэніс і хакей. Часцяком экіпіроўку гульцам забяспечвае клуб.

Спайкі — €50. Пастка — €50. Добрая біта каштуе ў раёне 150-200. Мяч — 1-2.

Існуе і зборная краіны, якая рэгулярна бярэ ўдзел у чэмпіянатах Еўропы, там беларусы пакуль выступаюць у групе В. Фаварытамі старога кантынента ў бейсболе лічацца галандцы і італьянцы.

ДЗЕЦІ — НАША БУДУЧЫНЯ

Актыўнае развіццё бейсбола ў краіне сёння вядзецца і на дзіцячым узроўні. Трэніры сцвярджаюць, што пачынаць займацца можна з 9 гадоў, для гэтага не трэба мець асаблівых здольнасцяў, а каб экіпіраваць дзіця, няма неабходнасці ў вялікіх фінансавых выдатках.

Пакуль праблемнай зонай застаюцца рэгіёны, там часам складана знайсці трэнераў і палі для гульні ў бейсбол. Каб збудаваць пляцоўку, неабходны прыкладна адзін гектар зямлі. Сёння такія спецыяльна абсталяваныя палі ёсць толькі ў Брэсце, Мінску, Скідзелі і Лагішыне. Што тычыцца спецыялістаў, якія маглі б працаваць з дзецьмі, то яны ёсць, але дыпламаваных трэнераў мала. Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры выпусціў некалькі курсаў настаўнікаў па бейсболе, але ў сувязі з недастатковай колькасцю ахвотных, аддзяленне было закрыта.

Аляксандр СЯЧКО, галоўны трэнер бейсбольнага клуба «Мінск», генеральны сакратар Асацыяцыі бейсбола Беларусі:

— Бейсбол — гэта класны спорт, ім займаюцца мільёны чалавек на планеце, гэта як спартсмены, так і аматары. У Беларусі ён ужо перастаў быць экзотыкай, сёння ёсць хлопцы, якія паказваюць добрую гульню і фарміруюць прыстойны ўзровень бейсбола ў краіне. Такі ж добры ўзровень паказваюць і нашы суседзі: расіяне, украінцы, палякі. Пакуль што нам не хапае заўзятараў, але, магчыма, сітуацыя хутка зменіцца.

Што тычыцца клуба «Мінск», то ў гэтым годзе мы сталі чэмпіёнамі краіны і выйгралі Інтэрлігу. Радасці ад перамогі ва ўнутраным чэмпіянаце, на жаль, мала, таму што ўдзельнічаюць усяго 3 каманды, канкурэнцыя невялікая.

Разам з «Мінскам» мы прывезлі фінал Інтэрлігі ў сталіцу, сабралі ўсе лаўкі, якія можна было знайсці на палях, дзе мы гуляем, усталявалі адну трыбуну, і ўсе месцы былі заняты, гэта значыць, людзей пачынае цікавіць бейсбол. Магчыма, не ўсе клубы пакуль робяць патрэбныя маркетынгавыя крокі, каб папулярызаваць гульню. Мы ў «Мінску» спрабуем пачынаць з малога — вонкавага выгляду гульца, бо людзей у першую чаргу прыцягвае карцінка.

Цяпер у нас сумесна з Дзмітрыем Сагальчыкам узнікла ідэя стварыць лігу для ўсходняй часткі Еўропы. У гэтых краінах прыкладна аднолькавы ўзровень бейсбола, і было б нядрэнна развівацца разам, а потым — змагацца на роўных і з астатнімі краінамі старога кантынента.

Існуюць пэўныя праблемы з дзіцячым спортам — мала трэнераў, у нас у клубе, напрыклад, яны ўсе з прафільнай адукацыяй, а ў рэгіёнах — не. Дзеці ў бейсбол ідуць, у «Мінску» цяпер каля 70 юных спартсменаў розных узростаў. Якраз у зімовы перыяд у нас з'явіцца магчымасць вывозіць іх на турніры, што, безумоўна, карысна.

Што тычыцца дарослых гульцоў і асноўнай каманды, то гэта ў большасці маладыя хлопцы (1989—2000 года нараджэння). Іх заробкі ў клубе адносна невысокія, таму многім даводзіцца сумяшчаць бейсбол з працай.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

Цікавыя факты пра бейсбол:

— Высакакласны пітчар можа кінуць мяч з хуткасцю 160 км у гадзіну.

— Для правядзення сярэднестатыстычнага бейсбольнага сезона для патрэб найвышэйшай лігі бейсбола MLB (ЗША) патрабуецца высекчы 4800 дрэў ясеню, з якіх вырабляюць бейсбольныя біты.

— Бейсбольны мяч мае роўна 108 шыўкоў.

— Існуе версія бейсбола для сляпых пад назвай «Веер бейсбол», праходзіць уласная сусветная серыя, тут гуляюць 27 каманд.

— У MLB суддзі абавязаны, згодна з правіламі, насіць толькі чорнае адзенне.

ЧЭМПІЯНАТ ЗАВЕРШАНЫ

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра вынікі першынства краіны па футболе, а таксама выступленні беларускіх спартсменаў на міжнародных турнірах.

1. Завяршыўся чэмпіянат краіны па футболе сярод каманд найвышэйшай лігі. *Матчы апошняга тура выявілі ўладальніка бронзавых медалёў першынства. Імі сталі футбалісты салігорскага «Шахцёра», які ў Брэсце абыграў «Дынама» з лікам 2:1. Адзначым, што нападаючы гарнякоў Мікалай Януш стаў найлепшым бамбардзірам 25-га нацыянальнага першынства, забіўшы 15 мячоў.*

Канкурэнт «Шахцёра» ў барацьбе за бронзавыя ўзнагароды бабруйская «Белшына» на сваім полі прайграла мікашэвіцкаму «Граніту» 0:1 і засталася на 4-й выніковай пазіцыі ў турнірнай табліцы.

Футбольны клуб з Гомеля заняў апошняе месца ў чэмпіянаце і ў наступным сезоне будзе выступаць у першай лізе. У заключным матчы гамяльчане прайгралі ўладальніку «срэбра» мінскаму «Дынама» — 1:2. «Золата» чэмпіянату дасталася барысаўскаму БАТЭ.

Нагадаем, у наступным сезоне элітны дывізіён будзе пашыраны да 16 клубаў, таму яго папоўняць адразу 3 найлепшыя каманды з першай лігі. Два навабранцы ўжо вядомы — гэта «Ізлач» і «Гарадзея», а на апошнюю пуцёўку за тур да заканчэння спаборніцтваў прэтэндуюць магілёўскі «Днепр» і сталічны клуб «Крумкачы», якія 15 лістапада сустрэнуцца ў Мінску.

2. Зборная Беларусі па гандболе завяршыла выступленне ў міжнародным турніры Provident Cup у венгерскім Дэбрэцэне. Нашы гандбалісты прынялі ўдзел там у рамках падрыхтоўкі да чэмпіянату Еўропы, які пройдзе ў студзені наступнага года ў Польшчы.

На старце турніру падапечныя Юрыя Шаўцова саступілі зборнай Аргенціны з лікам 23:30, а на наступны дзень прайгралі першай камандзе Венгрыі — 20:32, завяршылі сваё выступленне беларусы пераможным матчам з другой зборнай Венгрыі — 25:21.

Гульні сваёй каманды пракаментаваў Сяргей РУТЭНКА:

— Непрыемны вынік матча з першай камандай Венгрыі, не атрымалася закінуць шмат мячоў. Аднак у гэтай сустрэчы галоўным быў не вынік, трэнеру трэба было праверыць маладых хлопцаў, апрабаваць нейкія задумкі. Наша галоўная задача — падрыхтавацца да чэмпіянату Еўропы. У камандзе шмат новых хлопцаў, яны павінны прыстасавацца да гульні зборнай. Пасля гэтага матча трэба вырашаць шмат пытанняў. Бо з такой гульнёй нам на чэмпіянаце Еўропы рабіць няма чаго.

На групавым этапе кантынентальнага першынства наша зборная сустрэнецца з камандамі Харватыі, Ісландыі і Нарвегіі.

— Вядома, мы апынуліся ў вельмі складанай групе, але абавязкова пазмагаемся з імі і пастараемся прайсці далей, — адзначыў Сяргей Рутэнка.

3. Наша зборная па хакеі стала пераможцай міжнароднага турніру Euro Ice Hockey Challenge ў Ліепаі. Спачатку беларуская каманда абыграла хакеістаў Італіі 1:0, потым латышоў — 4:3, а ў заключным матчы турніру беларусы былі мацнейшымі за японскіх калег — 3:0. **Галоўны трэнер зборнай Дэйв ЛЬЮІС** застаўся задаволены выступленнямі падапечных на турніры.

— Мы хочам пусціць магутную «каранёвую сістэму» ў беларускі хакей, таму поспехі маладых гульцоў на такіх турнірах вельмі важныя. Ёсць некалькі хакеістаў, дзеянні якіх сталі прыемным адкрыццём для мяне. Напрыклад, я не так шмат ведаў пра Паўла Баярчука, але ён праявіў сябе выдатна на працягу ўсяго турніру. У Латвіі самымі стабільнымі былі, напэўна, Дзямкоў і Волкаў. Мы працягнем сачыць за гэтымі хлопцамі ў сезоне, назіраць за іх прагрэсам у клубах для таго, каб запрасіць кагосьці і на наступныя турніры каманды, — адзначыў спецыяліст.

Гульні на міжнародным турніры ў Латвіі сталі першым этапам падрыхтоўкі нацыянальнай зборнай да чэмпіянату свету па хакеі, які пройдзе з 6 па 22 мая 2016 года ў Маскве і Санкт-Пецярбургу. Наступны збор каманда краіны пачне ў сярэдзіне снежня, які завершыцца турнірам у Швейцарыі Arosa Challenge Cup.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

Малюнак Марыны ГАРЭЛАВАЙ.